Табліца 6 — Ступень валодання рускай мовай у сферы адукацыі

| Рэспандэнты | Пасіўныя навыкі | | Актыўныя навыкі | |
|---|---|---|---|---|
| | слуханне | чытанне | гаварэнне | пісьмо |
| навучэнцы і студэнты | 52 (11,2%) | 8 (1,7%) | 21 (4,5%) | 385 (82,6%) |
| работнікі сферы адукацыі | 7 (4,0%) | 1 (0,6%) | 16 (9,1%) | 152 (86,4%) |

Такім чынам, аналіз маўленчай сітуацыі ў сферы адукацыі дазваляе зрабіць наступныя вывады:

- ужыванне беларускай, рускай, польскай мовы і «трасянкі» ў маўленні дэтэрмінаваны шэрагам разнастайных фактараў, найбольш адметнымі сярод якіх з’яўляюцца мова навучання, маўленчая кампетэнцыя, узровень адукацыі і моўнае асяроддзе;
- навучэнцы і студэнты часцей за работнікаў сферы адукацыі размаўляюць з бабуляй і дзядулем па-беларуску і на «трасянцы», але, як вядома, адказы рэспандэнтаў маюць суб’ектыўны характар і ў анкеце няма размежавання літаратурнай і дыялектнай форм маўлення;
- руская мова пераважае ва ўсіх камунікатыўных зносінах інфармантаў дадзенай сферы;
- навучэнцы і студэнты паказалі вышэйшы працэнт актыўна-пасіўных навыкаў валодання беларускай і рускай мовамі ў параўнанні з работнікамі сферы адукацыі (табліцы 5 і 6).

**Спіс літаратуры**


1.*Губогло, М.Н.* О роли языковой компетенции и речевой деятельности в освоении культуры: по материалам Молдавской ССР / М.Н. Губогло // Полевые исследования Института этнографии, 1975: сб. ст. — М.: Наука, 1977. — С. 154—155.

2.*Русецкий, В.Ф.* Совершенствование речевой культуры и особенности современной речевой ситуации / В.Ф. Русецкий // Народная асвета. — 1998. — №12. — С. 72—84.

3.*Траханкина, Т.А.* Языковая ситуация в современном белорусском городе (Новополоцк): опыт регионального социолингвистического исследования: моногр. / Т.А. Траханкина. — Минск: БГАТУ, 2004. — 242 с.


# МЕТАДЫ І ПРЫЁМЫ РАЗВІЦЦЯ ПАЗНАВАЛЬНАЙ АКТЫЎНАСЦІ ВУЧНЯЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ


***Н.У. Раманчук***


Сістэма адукацыі на сучасным этапе знаходзіцца ў стане пошуку ідэалаў, прыярытэтаў, каштоўнасцей, якія павінны надаць пэўную накіраванасць вучэбна-выхаваўчаму працэсу. У якасці аднаго з арыенціраў асобаснага развіцця вучня, а значыць, і своеасаблівага прыярытэту ў педагогіцы, можа выступаць пазнавальная актыўнасць.

Развіццё пазнавальнай актыўнасці вучняў з’яўляецца адной з актуальных праблем як метадычнай навукі, так і ўсяго вучэбнага працэсу сучаснай школы, бо ў ёй акумулююцца вытокі многіх адукацыйных напрамкаў: фарміраванне пазнавальных інтарэсаў, развіццё самастойнасці, разумовых здольнасцей, выхаванне ініцыятыўнасці, мэтанакіраванасці, адказнасці, самакрытычнасці, сілы волі. А як вядома, праблема развіцця асобы дзіцяці — адна з важнейшых праблем сучаснай педагагічнай навукі. Пытанні развіваючага навучання знаходзяцца ў полі зроку псіхолагаў і дыдактаў. Розныя аспекты развіваючага навучання даследавалі Л. С.Выгоцкі, В. В.Давыдаў, А. М.Мацюшкін, Д. Б.Эльконін і інш. Праблему рэалізацыі суб’ект-суб’ектных адносін у працэсе навучання разглядалI Ш. А.Аманашвілі, В. К. Дзьячэнка, Г. А. Цукерман і інш. Даследаваннем фарміравання пазнавальных інтарэсаў вучняў як педагагічнай праблемы займаліся М. В. Кухараў, А. К. Маркава, М. В. Мацюхіна, Т. І. Шамава, Г. І. Шчукіна. А. К. Маркава неабходнай умовай стварэння ў вучняў цікавасці да зместу навучання, фарміравання пазнавальнай актыўнасці лічыць магчымасць праяўлення імі падчас навучання разумовай самастойнасці і ініцыятыўнасці [1, с. 292].

Гістарычна склалася, што паспяховасць вучэбнай дзейнасці залежыць ад інтэлектуальнага ўзроўню асобы. Аднак у даследаваннях А. А. Рэана адзначаецца, што высокая пазітыўная матывацыя можа выступаць кампенсаторным фактарам недастатковага запасу ў вучняў ведаў, уменняў, навыкаў [2, с.58].

Для атрымання інфармацыі аб адносінах настаўнікаў да праблемы фарміравання пазнавальнай актыўнасці вучняў на ўроках па беларускай літаратуры мы выкарыстаілі такі метад, як анкетаванне. Намі быў анкетаваны 31 рэспандэнт. Пераважная большасць удзельнікаў анкетавання (71%) сцвярджае, што менавіта пазнавальны інтарэс (а не разумовыя здольнасці, не аб’ём ведаў, уменняў і навыкаў) забяспечвае паспяховае навучанне вучняў у большай ступені.

Атрыманыя дадзеныя сведчаць аб тым, што большасць настаўнікаў ўсведамляе значнасць праблемы, а значыць, імкнецца да яе вырашэння пэўнымі шляхамі: 39 % настаўнікаў з мэтай развіцця ў вучняў пазнавальнай актыўнасці аддаюць перавагу праблемнаму навучанню, 71 % настаўнікаў выкарыстоўвае на сваіх уроках эўрыстычную гутарку, 12 % адзначылі часткова- пошукавы метад. Але выпушчаны з-пад увагі

настаўнікаў новыя, сучасныя падыходы да выкладання літаратуры. Некаторыя настаўнікі валодаюць пэўнымі метадычнымі прыёмамі, формамі работы, але не выкарыстоўваюць іх на практыцы з-за абмежаванасці часу. Ёсць і такія педагогі, якія аддаюць перавагу выключна апрабаваным метадам і прыёмам навучання.

Відавочна, што праблема развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў патрабуе пошуку новага ў тэорыі і практыцы, новых падыходаў да далейшага ўдасканалення зместу, форм, метадаў і спосабаў навучання, накіраваных на рэалізацыю прынцыпу актыўнасці ў вучэнні, які мае вырашальнае значэнне ў сучасных умовах, бо ад якасці вучэння залежыць не толькі вынік навучання, развіцця і выхавання школьнікаў, але і фарміраванне адносін навучэнцаў да ўласна пазнавальнай дзейнасці. Праблема фарміравання пазнавальнай актыўнасці вучняў на ўроках беларускай літаратуры зацікавіла нас з прычыны неабходнасці аптымізацыі працэсу навучання літаратуры і фарміравання актыўнай дзеючай пазіцыі вучняў.

Праяўленне пазнавальнай актыўнасці асобы ў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці выступае неабходнай умовай эфектыўнага вырашэння задач навучання. Гэтаму садзейнічае распрацоўка і ўкараненне ў школьную практыку спецыяльных адукацыйных тэхналогій.

Працэсуальная частка тэхналогіі фарміравання пазнавальнай актыўнасці канструюецца, зыходзячы з наступных палажэнняў:

– асноўны прынцып фарміравання пазнавальнай актыўнасці — уключэнне вучняў у творчую дзейнасць, прыватным выпадкам якой выступае дзейнасць па вырашэнні праблем;

– на ўроку павінна быць выкарыстана сістэма сродкаў, якія забяспечваюць аптымальны ўзровень пазнавальнай актыўнасці вучняў на ўсіх этапах засваення;

– кожны з выкарыстоўваемых сродкаў фарміравання пазнавальнай актыўнасці для максімальнай рэалізацыі свайго патэнцыялу павінен аказваць станоўчы ўплыў на ўсе яе кампаненты (матывацыйны, зместавы, працэсуальны) з улікам індывідуальных асаблівасцей іх сфарміраванасці.

Паспяховаму вырашэнню праблемы выхавання актыўнай творчай асобы ў школе садзейнічае мэтанакіраванае і сістэматычнае прымяненне вучэбных творчых заданняў. У іх настаўнікі бачаць эфектыўны сродак развіцця мыслення, пазнавальнай самастойнасці вучняў. Вучэбныя творчыя заданні характарызуюцца як заданні з уключанымі супярэчнасцямі. Іх выкананне прадугледжвае перанос ведаў, уменняў і навыкаў у новую сітуацыю.

Вучэбныя творчыя заданні павінны:

– уяўляць сабой сістэму, разлічаную не толькі на ўзбраенне вучняў ведамі, але і на развіццё самастойнасці мыслення школьнікаў;

– адпавядаць унутраным запытам вучняў, адпавядаць іх тэндэнцыі да творчай самастойнасці, актыўнасці ў пазнанні;

– па сваёй складанасці ў нейкай ступені перавышаць унутраныя сілы вучняў і патрабаваць ад іх мабілізацыі вышэйшых пазнавальных магчымасцей;

– ставіць школьнікаў перад неабходнасцю разглядаць факты і з’явы ў розных аспектах;

– пабуджаць вучняў да свядомага прымянення лагічных прыёмаў.

Вучэбныя творчыя заданні абумоўліваюць станоўчыя адносіны вучняў да дзейнасці. Роля гэтых заданняў поліфункцыянальная. Акрамя асноўных функцый (навучанне, выхаванне, развіццё), яны выконваюць дыягнастычную функцыю і функцыю кантролю.

Так, пры вывучэнні раздзела «Інтымная лірыка» ў якасці прыкладу вучэбнага творчага задання можна прывесці наступнае: суаднесці псіхалагічныя азначэнні кахання са станам лірычных герояў вершаў М. Багдановіча «Раманс, А. Куляшова «Бывай», С. Шушкевіча «Ты мне вясною прыснілася...», С. Грахоўскага «Як я жыў без цябе». Абгрунтаваць сваю думку.

– «эрас» — страснае імкненне да поўнага авалодання;
– «людус» — каханне-гульня, якой не ўласціва глыбіня пачуцця і дастаткова лёгка дапускаецца магчымасць здрады;
– «сторге» — цёплае і трывалае каханне-сяброўства;
– «прагма» — сумяшчае людус і сторге, каханне па разліку;
– «манія» —каханне-залежнасць ад аб’екта свайго пачуцця;
– «агапе» — бескарыслівае каханне, страснае і цёплае.

Як форму выражэння свайго разумення і адносін да вывучаемага твора можна разглядаць стварэнне малюнкаў-схем. Такі від творчай работы вучняў старшых класаў дае магчымасць кожнаму самавыявіцца: у малюнках, схеме, неардынарным вобразе-сімвале. Уключаюцца навыкі лагічнага і абстрактнага мыслення, уменне класіфікаваць, абагульняць, праводзіць аналогіі, працуе інтуіцыя, уяўленне і фантазія, ствараецца сітуацыя, якая вымагае прымянення атрыманых ведаў на практыцы. Так, пры вывучэнні верша У. Караткевіча «Беларуская песня» мэтазгодна наступнае заданне: стварыць літаратурна-мастацкі пашпарт Беларусі. Падчас працы з творам «Паром на бурнай рацэ» можна прапанаваць школьнікам намаляваць гербы родаў Горава і Пора-Леановіча. Пры выкананні дадзенага задання галоўным патрабаваннем выступае захаваць адпаведнасць твору яго ідэі.

Методыка выкарыстання схем-творчых заданняў на ўроках літаратуры дазваляе, акрамя асноўнай задачы, развіцця пазнавальнай актыўнасці і творчых здольнасцей вучняў, вырашаць традыцыйныя задачы:

вызначыць узровень засваення праграмнага матэрыялу, выявіць прабелы ў развіцці маўленчых навыкаў, вызначыць агульны ўзровень інфармаванасці, начытанасці вучня і інш. Не маючы спецыяльнай магчымасці займацца рыторыкай, на ўроках беларускай літаратуры школьнікі вучацца выступаць перад аўдыторыяй, абуджаць цікавасць да свайго меркавання. Схемы-творчыя заданні дазваляюць працаваць над фарміраваннем даследчых уменняў у вучняў старшых класаў, весці падрыхтоўку да іх далейшай творчай інтэлектуальнай дзейнасці.

Першапачатковае чытанне павінна нараджаць моцныя эмацыянальныя імпульсы, уяўленні, уводзіць чытача ў мастацкі свет твора, забяспечваць яго поўнае ўспрыманне. Каб яно было больш эмацыянальным і свядомым, пры правядзенні ўрокаў мэтазгодна выкарыстоўваць прыём «*Інсерт*». Сутнасць яго заключаецца ва ўменні прагназаваць. Першы від заданняў: вызначыць ідэю верша на аснове толькі зарыфмаваных слоў. Магчыма іншая інтэрпрэтацыя прыёму «*Інсерт*». Перад вывучэннем інтымнай лірыкі вучням можна прапанаваць падабраць эпіграф да ўрока на тэму «Каханне... Якое яно?» Пачуццёвая гама эпіграфаў атрымліваецца досыць разнастайная: каханне, і боль, і радасць, і суцяшэнне, і спакуса, і вызваленне. Заданне: пасля першага прачытання верша вызначыць, чыё «прагназаванне» спраўдзілася, чый эпіграф можна выкарыстаць на дадзеным уроку?

Выкарыстанне дадзенага прыёму дапамагае зрабіць першаснае ўспрыманне твораў больш мэтанакіраваным, стымулюе пазнавальную актыўнасць і ўздзейнічае на пачуццёвую сферу чытача, асабліва калі вывучаюцца творы дадзенай тэматыкі.

Да актыўных прыёмаў навучання, якія садзейнічаюць мэтанакіраванаму вывучэнню мастацкага твора, актывізацыі пазнавальнага інтарэсу вучняў варта аднесці «Сінквейн» — пяцірадкоўе; твор, які складаецца з пяці радкоў.

Да прыкладу, сінквейн, створаны вучнем 8 класа па вершы А. Русака «Дзе ты, зорка мая?» можа быць такім:

Зорка
Ясная, непагасная
Скацілася, узыдзі, засвяці
Без цябе дарога няясная
Каханне

Павышэнне навуковага ўзроўню сучаснай школьнай адукацыі патрабуе выкарыстання новых арганізацыйных форм, якія забяспечваюць актыўнае вучэнне. Адным з дасягненняў сучаснай педагагічнай навукі лічым распрацоўку асноў тэхналогіі канцэптуальнай мнагазначнасці. Канцэпт — адлюстраваны ў знакавай, схематычнай, тэзіснай ці іншай форме зместавы вобраз тэмы, агульнасць каштоўнасных характарыстык, атрыманых у выніку ўнутрыпрадметнага, міжпрадметнага інтэгрыравання, або сістэма фундаментальных адукацыйных аб’ектаў і іх разнастайныя функцыянальныя праявы як у рэальным, так і ў ідэальным свеце [3, с.51]. Канцэпты — адзінкі, з дапамогай якіх мы асэнсоўваем слова ці тэкст. Канцэпт адлюстроўвае пэўную сутнасць, устанаўлівае адносіны паміж значэннем слова, меркавання, тэксту і некаторым мноствам сэнсавых альтэрнатыў.

Выяўленне мнагазначнага канцэпта пэўнага меркавання, навуковага і мастацкага тэксту і змяшчэнне яго сэнсавых адценняў у створаныя вучнем імправізаваныя дыялогі складае змест прапануемай тэхналогіі.

У нашым вопыце вызначылася наступная паслядоўнасць выдзялення канцэпта і яго ўключэння вучнямі ў разнастайныя лінгвістычныя прадукты. Спачатку выяўляецца сэнс і вобраз тэмы, аднясенне яго да яго канцэпта. Напрыклад, пры вывучэнні верша М. Танка «Шчасце» быў выдзелены адпаведны канцэпт. Затым высвятляецца меркаванне вучня ў адносінах да выяўленага канцэпта: «Па-мойму, шчасце — гэта...» Асабістае ўяўленне аб сэнсе канцэпта суадносіцца з навуковым па слоўніках ці іншых крыніцах. Мнагазначна асэнсаваны канцэпт у пэўным кантэксце ўяўляе сабой зыходную аснову стварэння імправізаваных эцюдаў ці сачынення-мініяцюры. Вучням прапануецца паразважаць: «Для мяне шчасце — гэта...».

У абагульненым педагагічным вопыце да сродкаў выдзялення і імправізаванага асэнсавання канцэпта адносяцца: канструяванне ўласных сітуацый, прывядзенне прыкладаў, выкарыстанне моўных узораў і вусных тэм; самавыяўленне на аснове мастацкага тэксту; запіс уласнай мовы, свайго ўнутранага маналога, звернутага да пэўнага адрасата, або сваіх суразважанняў з аўтарам. Апошні прыём быў выкарыстаны пры вывучэнні верша С. Шушкевіча «Ты мне вясною прыснілася...»: «Якім павінен быць чалавек, здольны натхніць на стварэнне мастацкага шэдэўра?» (разважанне з Шушкевічам). Разумовая самастойнасць, ініцыятыўнасць, творчасць, праяўленыя падчас выканання заданняў такога характару, выступаюць важнымі ўмовамі фарміравання пазнавальнай актыўнасці школьнікаў.

Адным з магчымых сродкаў вырашэння праблемы фарміравання пазнавальнай актыўнасці вучняў на ўроках беларускай літаратуры на сучасным этапе лічым інтэграцыю медыяадукацыі ў вучэбныя прадметы: гэта ўзбагачае вучэбны працэс цікавым зместам, новымі формамі і прыёмамі работы. Перавага мультымедыйнай праграмы ў тым, што вучань падчас самастойнай дзейнасці як на ўроку, так і дома можа выбіраць уласны тэмп працы, пасільны аб’ём інфармацыі і ступень яе цяжкасці. Вучні больш грунтоўна запамінаюць новы матэрыял, павышаецца іх матывацыя да пазнання школьных прадметаў, фарміруецца ўменне работы з інфармацыяй.

Урок, на якім выкарыстоўваецца камп’ютэрная тэхніка і праграмныя сродкі навучання, атрымаў назву — «мультымедыя-урок». Камп’ютэр ніколі не заменіць настаўніка, а толькі дапаможа зрабіць яго працу больш эфектыўнай. Па-першае, педагог на медыя-ўроку часцей за ўсё выступае ў якасці кансультанта, а гэта значыць, ён зможа адвесці на індывідуальную работу з вучнямі больш часу. Па-другое, ёсць унікальная магчымасць зрабіць урокі роднай літаратуры больш цікавымі, наглядными і дынамічнымі. Па-трэцяе, школьнікі за даволі кароткі тэрмін лепш запамінаюць неабходны матэрыял, больш глыбока ўсведамляюць яго сутнасць.

На сёння беларускамоўныя электронныя падручнікі і энцыклапедыі па літаратуры адсутнічаюць. З дапамогай камп’ютэрнай графічнай праграмы Power Point настаўнік пры жаданні можа сам стварыць і паказаць вучням на экране набор слайдаў з разнастайнымі схемамі, табліцамі, малюнкамі, фотаздымкамі, неабходным тэкстам.

Большасць настаўнікаў, аналізуючы магчымасці метадычнага комплексу (у першую чаргу падручніка), адзначаюць, што праграмныя творы для 8 класа падабраны высокамастацкія, вялікі іх выхаваўчы патэнцыял: Г. Далідовіч «Губаты», В.Быкаў «Жураўліны крык», У.Караткевіч «Беларуская песня» і іншыя. Але як істотны недахоп падручніка настаўнікі адзначаюць невысокую якасць пытанняў да твораў: «Адчуваецца шаблоннасць: Якім пачуццём прасякнуты радкі?, Якімі сродкамі малююцца вобразы ў творы?» і інш.

Такім чынам, для фарміравання пазнавальнай актыўнасці вучняў вялікае значэнне мае ўменне настаўніка ўздзейнічаць на мысліцельную дзейнасць вучняў і іх унутраную эмацыянальна-псіхалагічную сферу. Майстэрства навучання і заключаецца ў тым, каб дасягнуць арганічнага спалучэння гэтых двух напрамкаў педагагічнага ўздзеяння — рацыянальнага і станоўча-эмацыянальнага — і прывесці ў дзеянне як знешнія, так і ўнутраныя фактары мысліцельнай актыўнасці школьнікаў. Неабходна, каб набытыя вучнямі веды станавіліся іх асабістымі перакананнямі, пераўтвараліся ў творчую энергію, ва ўменне ўзбагаціць сябе, сваю духоўную культуру. Пазнавальная актыўнасць выступае не столькі праяўленнем устойлівай рысы асобы, колькі адлюстраваннем зададзеных умоў дзейнасці. Гэта адкрывае магчымасці арганізаваных дыдактычных уздзеянняў.

Школьны курс літаратуры дае магчымасці для фарміравання і развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў пры адпаведным выбары метадычных прыёмаў і арганізацыйных форм, найбольш значнымі з якіх з’яўляюцца вучэбныя творчыя заданні; заданні, якія прадугледжваюць магчымасць выбару; калектыўныя заданні; мультымедыя-ўрокі; выкарыстанне элементаў тэхналогіі канцэптуальнай мнагазначнасці; выкарыстанне элементаў тэхналогіі крытычнага мыслення.

Прапанаваная сістэма метадычных прыёмаў і арганізацыйных форм для фарміравання пазнавальнай актыўнасці вучняў на ўроках беларускай літаратуры дае багатыя магчымасці не толькі для абуджэння пазнавальнага інтарэсу, але і спрыяе разумоваму развіццю вучняў.

**Спіс крыніц**


1.*Зимняя, И. А.* Педагогическая психология: учеб. пособие / И. А.Зимняя. – Ростов н/Д.: Феникс, 1997. – 480 с.

2.*Реан, А. А.* Социальная педагогическая психология / А. А. Реан, Я. Л. Коломинский.- СПб.: ЗАО Питер, 1999. – 416 с.

3.*Хуторской, А. В.* Развитие одаренности школьников: Методика продуктивного обучения: Пособие для учителя / А. В. Хуторской. – М., 2000.


## ВЫВУЧЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ ЛЕКСІКАГРАФІІ Ў КЛАСАХ ПАГЛЫБЛЕНАГА ЎЗРОЎНЮ


***І. І. Савіцкая***


1. Вучэбная праграма па беларускай мове для XI-XII класаў для базавага, павышанага, паглыбленага ўзроўняў (Мінск, Нацыянальны інстытут адукацыі, 2007 г.) указвае на значнае пашырэнне ў змесце вучэбнага матэрыялу тэарэтычнага складніка, што карэлюе з асноўнымі кампанентамі зместу навучання мове:

- лінгвістычныя веды, агульныя звесткі мовазнаўчага характару, інфармацыя пра айчынных вучоных-лінгвістаў;
- веды пра сістэму мовы і маўлення, асаблівасці іх функцыянавання;
- веды, звязаныя з адлюстраваннем у мове гісторыі, духоўнай і матэрыяльнай культуры народа — носьбіта мовы;
- уменні і навыкі ў розных відах маўленчай дзейнасці.

Як бачым, айчынная лексікаграфічная спадчына цалкам адпавядае актуальным патрабаванням да курса беларускай мовы ў агульнаадукацыйных установах рэспублікі. Менавіта праз вывучэнне здабыткаў нацыянальнага слоўніцтва магчыма выканаць такія акрэсленыя праграмай адукацыйныя задачы, як паглыбленне лінгвістычных звестак, цэласнага ўяўлення пра мову як культурна-грамадскую з’яву, гістарычна зменлівую, шматфункцыянальную сістэму, у значнай ступені залежную ад грамадскай практыкі; развіццё інтэлектуальных і творчых здольнасцей вучняў, фарміраванне навыкаў самастойнай вучэбнай дзейнасці.

У згаданай праграме адным з прынцыпаў пабудовы курса беларускай мовы ў школе названы культуралагічны, які прадугледжвае знаёмства і працу з культуралагічнымі тэкстамі, што адлюстроўваюць